Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа

§ 1. Беларуская мова як адлюстраванне нацыянальнага бачання свету. Літаратурная мова і народныя гаворкі

1. Прачытайце. Раскажыце пра разнавіднасці беларускай мовы.

Беларуская нацыянальная мова і яе формы

Беларуская мова — гэта нацыянальная мова беларускага народа. Нацыянальная мова — мова, якая з'яўляецца сродкам пісьмовых і вусных зносін нацыі.

Як іншыя нацыянальныя мовы, сучасная беларуская мова выступае ў дзвюх разнавіднасцях: літаратурнай і народна-дыялектнай. Кожная з гэтых разнавіднасцей мае свае сферы ўжывання і свае формы бытавання. Мясцовыя гаворкі тэрытарыяльна і функцыянальна абмежаваны. Яны існуюць у вуснай форме і выкарыстоўваюцца пераважна як сродак зносін сярод сельскіх жыхароў.

Беларуская літаратурная мова абслугоўвае (паралельна з рускай) розныя сферы дзейнасці беларускага народа. Беларуская літаратурная мова — унармаваная, агульнапрынятая і абавязковая для ўсіх членаў грамадства. Існуе ў вуснай і пісьмовай разнавіднасцях, мае разгалінаваную сістэму стыляў.

Гэта мова школы, друку, радыё[ф], тэлебачання, мастацкай літаратуры, гуманітарнай навукі і г. д. *(Паводле кнігі «Беларуская мова: прафесійная лексіка»).*

Нацыянальная мова	=	Літаратурная мова	+	Дыялектная мова

2. Прачытайце табліцу. Раскажыце, што адрознівае літаратурную мову ад дыялектнай.

Літаратурная мова	Дыялектная мова
Характэрна для ўсёй тэрыторыі краіны	Характэрна для пэўных мясцовасцей
Мае нормы	Норм не мае
Існуе ў двух варыянтах: вусным і пісьмовым	Існуе толькі ў вуснай форме

3. Прачытайце і параўнайце два тэксты. Вызначце, які з іх напісаны на беларускай літаратурнай мове, а які адносіцца да народных гаворак.

I. Звычайна кожная нацыя атаясамліваецца з адной нацыянальнай мовай, напрыклад, французы — з французскай, шведы — са шведскай, грузіны — з грузінскай і г. д. Аднак у сучасным свеце нярэдкія сітуацыі, калі адна нацыя карыстаецца некалькімі мовамі. Тыповым прыкладам можа служыць Швейцарыя. Швейцарцы — адна нацыя, аднак карыстаюцца яны французскай, нямецкай, італьянскай і рэтараманскай мовамі *(«Беларуская мова: энцыклапедыя»)*.

II. Ціпе́рь жысь намно́га лу́ччы, чым была́ ра́ньшы. Січа́с усё ёсь: і ра́дзівы, і лісапе́ты, і мытацы́клы, і пла́цці ра́зныйі мо́дныйі. Пыгля́дзіш друге́й рас на ціпе́рішнійю мыладзёш і ду́мыйіш: «Вам ні прішло́ся знаць усё то́я, што піріцірпе́лі калі́-та мы» *(Паводле кнігі «Беларуская дыялекталогія»)*.

На падставе ведаў пра беларускую мову прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць адрозненне літаратурнай мовы ад народных гаворак.

Прывядзіце з тэксту II пяць прыкладаў дыялектных слоў і іх адпаведнікаў ў літаратурнай мове. Запішыце парамі.

4. Прачытайце тэкст.

Беларуская мова з'яўляецца найважнейшым элементам культурнай спадчыны* беларусаў. Нацыянальна-культурная адметнасць народа найперш выяўляецца ў лексічным складзе мовы. Кожны народ вылучае і замацоўвае ў назвах найбольш важныя

Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

менавіта для яго аб'екты навакольнага асяроддзя, свет рэчаў і сваіх уяўленняў аб іх. Напрыклад, у мове беларусаў сустракаецца каля дваццаці паняццяў назвы «балота»: *балота, багна, дрыгва, твань, бездань, дрыгвянік, алёс, імшара, імшарына* і г. д. У арабскай мове налічваецца каля 5000 назваў вярблюда. А ў беларускай мове зафіксавана толькі адно адпаведнае слова.

У працэсе развіцця мовы за многімі словамі замацоўваецца вобразна-сімвалічнае значэнне, якое абумоўлена бытам, звычаямі, культурай народа. Так, у кітайцаў і ў некаторых іншых народаў белы колер можа ўспрымацца як сімвал[л] жалобы, смутку, а ў беларусаў гэту функцыю выконвае чорны колер. Назва кветкі *васілёк* з'яўляецца сімвалам Беларусі. Для Расіі сімвал Радзімы — *бяроза*, а для нарвежцаў *бяроза* — сімвал вынослівасці.

Працяглы працэс культуры беларускага народа адлюстраваўся таксама і ва ўстойлівых выразах: *студэнт смаргонскай акадэміі* і інш. *(Паводле Ф. Шумчыка)*.

У чым праяўляецца нацыянальна-культурная адметнасць народа? Прывядзіце прыклады.

Выпішыце з тэксту па 2 прыклады слоў, напісанне якіх адпавядае наступным правілам: «Правапіс ***о, э, а***»; «Правапіс ***у, ў***»; «Правапіс падоўжаных зычных»; «Правапіс ***д, дз***».

5. Устанавіце адпаведнасць паміж рускімі і беларускімі выразамі. Як у іх праяўляецца адлюстраванне нацыянальнага бачання свету?

1. Соловья баснями не кормят.	А. Кухар спіць, а суп кіпіць.
2. Шила в мешке не утаишь.	Б. Не маё гарыць — не мне тушыць.
3. Моя хата с краю — ничего не знаю.	В. З гутаркі хлеба не наясі.
4. Солдат спит — служба идёт.	Г. Лес чуе, а поле бачыць.

Запішыце беларускія прыказкі. Падкрэсліце словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.

6. Падрыхтуйце вуснае выказванне на адну з тэм: «Літаратурная мова і народныя гаворкі», «Беларуская мова як адлюстраванне нацыянальнага бачання свету».